**Мікола Касцюкевіч**

# Германія

**Тэксты, настроі, інтуіцыі**

KAMUNIKAT.org

**Мінск**
**Тэхналогія**
**1995**

KAMUNIKAT.org

## НОЧНЫ СУСВЕТ

Дрыготкі агністы дыск павольна ўцягваецца за хвалі далягляду, і шэры вэлюм паўзмроку ператвараецца ў змрочны паркаль. Пунсовая квецень лета канае ў летаргічным сне зімы.

Абцяжараны бясконцасцю, з глыбінь сусвету прыляцеў і накрыў зямлю празрыста-чорнымі крыламі вялізны птах ночы. З-пад калматага пер'я яскравіцца месяц-амулет, і зорныя вочы слёзна вышукваюць запозненую ахвяру, усхваляваную водсветам дзённага хараства. На стоены горад падаюць мёртвыя слёзы, і па пустых вуліцах пачынаюць блукаць здані марных спадзеваў.

Ноч. Сумная музыка ночы.

Палеглыя ў магілах марацць пра пакінуўшыя іх душы, жывыя ў ложках і ‘ля вогнішчаў выношваюць чырвань ранішняга росквіту. І ўсе нямеюць ад музыкі ночы…

Затоены звон цішыні аглушае, вымкнуўшы рэальнае светаўспрыняцце, і чорнае павуцінне чапляецца за церні калючых зданяў.

Вецер люляе лісце дрэў на кладох, дзе занікла пульсаванне продкаў. Ціха ўздыхае галлё, а на сэрцы камянее шчымлівы смутак па нязбытным, жахлівей за які бывае толькі туга па мёртвых. Няма нічога больш невыноснага за тугу па мёртвых…

Гатычны крыж адзіноты парахнее ў буянні самотнага пустазелля. Палахлівая ружа безнадзейна сівее ў грудзях, і мелодыя душы мітусіцца ў пустаце выпадковасці.

У найпатаемнейшыя куткі чалавечага "Я" халодна ўліваецца павольнае адчуванне імгненнасці подыху жыцця, спасцігаецца існасць вар'яцтва, а ў тумане вачэй з'яўляецца цень тагасветнае журбы.

Ты — чалавек.

Ты такі слабы і смяротны.

Дзіця адлічаных часам дзён. Пясочынка пустэльні, якая нема вішчыць пад абцасам наканаванасці.

Шт**о** жыццё чалавечае ў гэтым прадонным віры земнага быту, куды лёсы бязлітасна ўцягваюцца ды шалеюць? Незаўважная рыса ў невыразных абрысах вех, што стаяць праз усе дарогі Сусвету.

Маленькая, мізэрная зорачка, што блішчыць пералівамі свёй роспачы ў адвечнай цемры неба.

Адзінота спакусна зыркае вярэдлівым болем, і ў ледзяной цішы адчужэння пачынаюць выразна гучаць рытмы закаханага сэрца, няўздольнага ўжо ў сваёй роспачы паяднаць час і нагрэць прастору.

І страшэнная сіла раптам слепіць розум, няўмольна падхапляе і нясе некуды ў невымерную зорную вышыню, дзе мроіцца нешта атрутна-салодкае, згубнае і прыцягальнае, як страх хараства за таемнай няпэўнасцю. І падносіць яшчэ вышэй, у немажлівую пазамежнасць, дзе, раскінуўшы рукі, ляціць Залаты Бог. Ён вабіць далёка-далёка, да згубленых у акіяне надзеі выспаў Запаветнай зямлі — краіны вечнага юнацтва і душэўнай раўнавагі, жыхары якой валодаюць патаемнымі ведамі і мудрасцю, недаступнай простым смяротным.

KAMUNIKAT.org

**РАНАК**

Існенне дня як вынік страты ночы…

Фантастычнае былое і рэальная прышласць…

Чаргаванне часу прыстасоўвае мус і годзіць цемру з святлом.

Абяцанне жыцця знішчае таемнасць, і творца-ранак пачынае праяўляць абрысы соннага горада.

Геаметрыя гмахаў бязважкімі аб'ёмамі вырастае ў прасторы.

Срэбныя люстры вокнаў адбіваюць чарнату галля, змарнелага ў прывіднасці.

Стужка мёртвай дарогі няспешна дапівае туман, надоены золкімі графічнымі дрэвамі.

Гума першых машын казыча асфальт, і сутаргавая жаўціня светлафораў успыхвае колерамі запрашэння і перасцярогі.

Газоны асушаюць слёзы сумнай пяшчоты, што халоднай расой ляжыць на кветках, забытых маці-Флорай у каменнай рукатворнасці.

У глыбіні летаргічнага спакою кватэр пачынае разбягацца чароўная пачварнасць і жахлівая прыгожасць ночных дзівосаў, напалоханая вяртаннем жыцця да часова нерухомых целаў.

Чулая рамантыка неўтаймавана ўрываецца ў расчараванне абуджэння. І толькі памяць у летуценнях аднаўляе прыемны дотык тагасветнасці.

Неакрэсленасць часу і настрою пачынае ўсталёўвацца ў суіснаванні з рэальнасцю.

Рыхтаванне няўхільнай сустрэчы з дзённай мітуснёй загараецца фіранкамі на вокнах, і касыя квадраты святла кладуцца на спрасаванае ночнаю цемрай паветра.

Але цнатлівасць ночы ўжо выношвае разбэшчанасць дня, і чырвань чакання павольна залівае далягляд.

Першароднасць перамагае электрыку, і знічкі ў дамох сведчаць пра хуткую перамогу жывога начыння дамоў над бязлюддзем вуліцы.

Паводзіны прачнуліся і напаўняюць інфантыльнасць пустаты сэнсоўнасцю памкненняў.

Нерухомы спакой, скрадзены мітуснёй рухаў, пачынае чакаць новага забыцця.

**СПАДЗЕЎ**

Найлепшы падарунак — выпадковы.

Фантазія абмяжоўвае жаданні, і чароўныя гукі захопленага сэрца патанаюць у велічнай мелодыі самазнішчэння.

Каб апраўдаць разгубленасць, увачавідкі мыю сэрца, перш чым падаць табе адзенне.

На белай сукенцы застаюцца празрыстыя сляды чысціні ад маіх заскарузлых пальцаў.

Ты здзіўляешся, бо нават твой захаваны пачатак пакідае толькі цёмныя плямы.

Нічога дзіўнага, ты вучышся сартаваць клопаты і спасцігаеш утрыманне гатовай разваліцца мітусні. А з таго, хто жыве ў вышыні, зорны пыл не асыпаецца нават пры імклівым спаданні.

Чым мацнейшы ўпадак, тым болей шанцаў выбіць дно і выляцець у новы космас.

Дзіця ненароджаных успамінаў, ты падсведама прагнеш пачатку, які, з грунту, і ёсць канцом.

Пяшчотная жорсткасць загартаваных мускулаў рассычаецца ў безабароннай свежасці і неспрактыкаванай патрабавальнасці.

Першародная годнасць сутыкаецца з узнёслай сапсаванасцю, і мы шалеем у гармоніі высокага палёту нізкай спрадвечнасці.

*

Мае загадкі спаталяюць тваю цікаўнасць неразвязальнай прастатой складаных пабудоў.

Забудзь учарашні дзень, азірніся на сябе заўтрашнюю і зразумееш мяне сённяшняга.

Даверся салодкай цемры, і грубая вытанчанасць інтэлекту адшліфуецца ў кволых дотыках моцы і магутным націску немачы.

Зрабі апошні крок і здымі н**а**вязку з вачэй. Ты ўбачыш пад сабою бездань. Злітуйся над крыламі і смела падай у вышыню.

Адштурхні рукі, гатовыя падхапіць і затрымаць, і смела даверся халоднаму позірку. Ён прыме твой немы крык.

Не бойся запсаваць слых пустэльніка, загартаванага адчужэннем.

Толькі безнадзейная стабільнасць гатова быць нязменна ветлай і зычліва працягваць адкрытыя рукі нават пад удары.

Адшукай страту ўвагі і зразумееш атруту насцярогі да неспадзяваных падарункаў, якія гарантуюць стабільнасць чакання.

Зрывай з кветак пялёсткі і ніколі не тапчы давер насалоды, бо ў ім жыве адзіна мажлівая шчырасць падману.

Попел заўсёдных слоў і полымя выпадковых учынкаў.

Бясконцыя ахвяры чужым балваном сваёй душы.

Пустата.

KAMUNIKAT.org

## ДЗЕСЯЦЬ ЗАЦЯЖАК

Мы, дзве паловы аднае істоты, нарэшце знайшлі адно аднаго і паядналіся. Мы найшчаслівейшыя і найняшчаснейшыя людзі ў свеце, бо яшчэ не разумеем сваёй касмічнай выракаванасці і жывем паводле законаў земнага быту. Нам няведамы час, тыя гадзіны і хвіліны, калі блізкасць парушае душэўную гармонію і робіцца смяротна небяспечнай для аднаго з нас.

Дзеці урбанізацыі, мы спасцігалі мастацтва сямейнага жыцця ў лабірынце вялікага горада.

Нам скрайне пашанцавала. Першыя акорды супольнай мелодыі загучалі ў памяшканні з патрэбнай акустыкай. Мядовы месяц узгараўся ў уласнай новай кватэры.

Шаснаццаты паверх. Вышэй толькі сусветная бездань і будучыня. Ніжэй — зямля, адзетая ў асфальт, і апранутая ў жыццё.

Цэлымі днямі й начамі мы спатолялі смагу кахання. Толькі чаргаванне эмоцыяў было сведкам нашых модлаў Залатому Богу ўзаемнасці.

Мы любілі неба, яно любіла нас.

А бедныя зоркі блішчэлі асляпляльнай зайздрасцю і падалі ад нашага гарачага дыхання. З цягам часу яны сталі такія звыклыя, што пацямнелі і перасталі заўважацца.

У нас дагэтуль усё добра, бо мы зведалі горыч адкрыцця адданага кахання, калі вар'яцееш ад шчасця і пэўнасці. З табой вельмі лёгка глядзець у былое, азіраючыся на ненароджаную будучнасць.

Як гэта складана — вартаваць каханне, калі ў ім няма сумневаў. Я трымаю ў далонях пякучы агонь узнёслай любові і малюся, каб твой земны пачатак не расціснуў мае рукі.

І толькі прывід незразумелай і ад таго яшчэ невыноснейшай тугі ўсё часцей наведвае мяне.

Нясведае жаданне апошняга канца як адзіна існага працягу запраўдных узаемінаў халодным подыхам смерці туманіць розум і вырывае з самацечнага стану. Я гэтага не ўсведамляю, але прага жыцця міжволі шукае лучнасці з рэчаіснасцю ў штучным забыцці.

Стаміўшыся турбаваць крокамі падлогу, я сядаю на падаконне і закурваю цыгарэціну. Гаркавы дым вырывае маю трывогу з хапошчаў тагасветнасці і вяртае ў красу летняга вечара.

Прапахлы пылам і мітуснёй, горад сцішваецца пад калыханку дзённай стомы. Аранжавыя далоні зморанага сонца ляжаць на сонных люстрах дамоў. Зялёныя абдоймы дрэў хаваюць запозненых

хадзякоў. З хуткасцю жыцця праносяцца і знікаюць у бясконцасці дарогі машыны. Нагрэты блакіт далягляду паглынае іх лёсы.

Хараство жывога каменнага наваколля змагаецца ў маёй душы з д'яблавымі кіпцюрамі.

Я адзін паміж небам і зямлёй, як паміж жыццём і смерцю. Як добра, што цябе няма побач і ніхто не замінае мне агоньчыкам цыгарэты выпякаць д'яблу вочы. Лёд, узніклы ад сутыкнення сокаў зямлі з агнём, салодкім чадам астуджае пекла роспачы. Яшчэ дзесяць зацяжак — і прывід невыноснай тугі растае, ў бязмежжы прасторы, падхоплены малекуламі шызай бязважкасці.

Ты, мая непадзельная палова, найдаражэйшы, і таму найневыноснейшы зараз чалавек, адкуль ты ўзнікла побач? Ты забіраеш мой паратунак і кідаеш у вышыню шаснаццатага паверху.

Гэта канец…

Я пераможаны…

Д'ябал рагоча…

Непаразуменне збірае роспач у выбух, і непаўсцяжлівая сіла выкідвае мой непарушны спакой у прагу акна.

Сэнс земнага быту страчвае апірышча, для замацавання якога забракла ўсяго дзесяці зацяжак.

Твая недарэчнасць абарвала нітку, што звязвала невымернасць жыцця з паўнатой існавання.

Звар'яцелая існасць паволі, але няўмольна выцягваецца у адзіна магчымую зараз палёгку — бясконцы лёт імгненнага падання.

І толькі твой немы крык заглушае выбух майго развітання з целам.

Мяне не стала.

Усё багацце маіх рухаў, голасу, адчування і пачуццяў знікла ў нябыт. А мозаг, які даваў выхад мікракосму ў матэрыяльную вонкавасць, запсутай машынкай астывае на асфальце.

Мяне не стала, але я ёсць.

Спрагнелая душа дасягнула гары асалоды і вярнулася ў несмяротнасць, страціўшы звязкі з пакутнай рэчаіснасцю. А на пакаранне — засталася знявечаная ўпадкам абалонка, якой ужо нічога, апроч абычаёвага схавання ад вачэй, не трэба.

Я буду чакаць твайго вызвалення, каб разам знікнуць у неведамай наканаванасці. Мая душа заўсёды будзе побач, але ты яе не заўважыш. Бо каянне і немач у папраўленні недарэчнасці да самага скону не дазволяць табе зразумець майго ўчынку.

………………………………………………………………………

Пакуль я жывы…

Але ніколі не забірай цыгарэціны, калі я ў роспачы куру на падаконні. Усяго дзесяць зацяжак — і мы зноў будзем шчаслівыя.

**ТАБЕ**

Восень. Парк. Зжоўклае лісце.

Лаўка старая, з выгнутай спінай. Пачатак стагоддзя — цяпер такіх не робяць. Яна наша. Мая і твая. Шурпатая, аблезлая фарба. Забытая, ссохлая хрызантэма.

Мінулае лета. Гарачы цёмны вечар. Густае зялёнае голле. Я, ты і наша каханне. Першае. Балючае. Назаўсёды.

Я зноўку тут, у мінулым.

Восень. Той самы парк. І тая самая лаўка. Зжаўцелае, мёртвае лісце. Побач новая сяброўка. Прыгожая, адданая, шчырая. Лепшая з лепшых. Пасля цябе.

Каля рэчкі смех, тупат. Зноў смех. Цішыня. Мы адныя на ўвесь парк. Сухое голле не закрывае ад чужой цікаўнасці. Мы і не хаваемся. Не сорамна.

Сумная красуня. Маўчым. Мы любім маўкліва. Навошта словы? Яны абавязваюць і хлусяць, хлусяць і абавязваюць. Ніколі не вер словам. Я веру. А ты не вер.

Маўчым. Думаем пра цябе. Кожны па свойму.

Зарванае лісце працірае паветра.

Ты прыйдзеш, прыбяжыш да мяне ўвечары. Я не праганю, не папікну. Навошта, калі ўсё роўна прыйшла восень. Калі сухая хрызантэма ўжо нікому не патрэбная. Налью табе духмянай гарбаты, ахутаю ногі пледам. Скора пачнуцца дажджы. Я з усімі аднолькава ветлы. Цяпер і з табой.

Недзе самотна плача скрыпка.

На выстаўленую далонь падае барвовы ліст. Маё сэрца, тваё сэрца, наша сэрца. Нічыё. Лісток мёртвы.

А скрыпка плача. Тужлівая, невыносная мелодыя. Некаму горш, чым мне. А можа не горш. Горай не бывае.

Восень суцішае мяне, мае пакуты. Не трэба. Яны салодкія. Побач новая сяброўка. Надзейная. Не здрадзіць, не схлусіць. Мы заўсёды разам. Сядзім, маўчым. Слухаем шэпты старога парку, старых дрэў, старога кахання. Вечнага кахання.

Яна можа, як і ты мінулым летам, кахацца проста тут, на пашарпанай лаўцы. Таемнасць, рызыка, зялёнае голле, гарачае цела… Навошта? Я ніколі не хвалюся, а ў пакоі лепш. Свечкі, мрок, стома. Кава і цыгарэты. Зноў стома. Забыццё.

Я сяджу на той самай лаўцы. Не адзін. На месцы той, што побач, мусіш быць ты. Першае каханне. Апошняе каханне. Вечнае

каханне. Забытая, ссохлая хрызантэма. Плача скрыпка. Некаму горш, чым мне. Чым табе. Чым нікому.

Сёння я падарыў табе хохліка. Смешная гумовая лялька. Найулюбёнейшая — з дзяцінства. Я доўга званіў. Смяялася цішыня, рвалася сэрца. Ты хацела, каб дома нікога не было. І каб не было мяне за дзвярыма. Але я быў. Марна званіў. І ты была. Марна хавалася. Ад мяне, ад сябе, ад кахання. Ад нічога.

Я не крыўдую. Я нават падараваў табе ўлюбёную цацку.

Ты прыйдзеш, прыбяжыш. Бо яшчэ цёпла, яшчэ не пачаліся даджы. Але ўжо восень. Мёртвае, зжаўцелае лісце. Забытая, ссохлая хрызантэма.

Не трэба плакаць. Казаць, што не можаш без мяне. У цябе ёсць ён. Ёсць лялька. У дзяцінстве мяне заўсёды суцяшаў хохлік. І табе будзе добра з ім. Ён быў першы, ён быў апошні. Ён заўсёды быў.

Недзе самотна плача скрыпка. Зараз пачнуцца дажджы.

Я буду мілавацца з жанчынамі. У выпадковых кватэрах, у цесных машынах на начной вуліцы, на лаўцы — як мы з табой. І заўсёды буду адзін. Сяброўка зразумее. І даруе.

Я не дараваў. Я доўга званіў. Смяялася цішыня, рвалася сэрца. У цябе засталося найдаражэйшае.

Забытая, ссохлая хрызантэма. Восень, стары парк, мёртвае лісце. І мы ўдвайгу. Я і мая новая сяброўка — АДЗІНОТА.

## КОЛЕРЫ ТУГІ

**1.**

Каханая,
па белым зломе пальцаў
ходзіць ранак —
так рана
сп'янелы,
акрываўлены туман
крануў сівую
скронь акна.
Каханая,
ад выпітага
ў цемрыве
віна
на ўсыпанай снягамі
прасціне звонкай
саспела гронка
асцярожнай
арабіны.
Адзіная,
нібы заблытаны ў галінах
моцны вецер,
кранулі цішыню
далоні,
і грудзі-промні
ператварыліся ў паўшар'і
пунсовых мараў.
Як дзіўна —
знікае хмаркай
узляцелай
агнём ахопленае цела,
а на пасцелі
чорным кнотам
тлее цноты
гонар.
Бездакорная,
дагэтуль вар'яцее
оргія
табой падоранага
гора —

так горда
быццё і сорам
ты забрала,
што боль,
пакінуты ў астрале,
будзённасцю зрабіўся,
дзе
адзіны dzen*
знішчае дзень.
Бездапаможны,
нібы цень,
сцякаю ў цемень сноў
і, можа,
суіснаванне дапаможа
забыць, што ты —
каханая чужая.

**3.**
Нязграбнаю
птушынай зграяй
за небакраем
дагарае
няспраўджаны наш
вырай:
з ахвяраваных колераў
я выбраў
заснежаную
тоеснасць тугі
і сімвал літасці —
чырвоны боль,
пакінены табою.

* Dzen – маецца наўвеце дзэн-будызм і звязаныя з ім практыкі.

## СОН

**1.**

Як успамін
і смутак веры —
павекаў веер
з карцін Вермеера
узяты,
а ў ім,
кранутыя зрокам
і распяты,
зялёны подых шкла.
Ты не памерла —
адышла.
Быццё,
кароткае, бы мара,
крылом кранула
і вярнулася
на наш,
даўно адрынуты ў нябыт,
заліты ў залатую барву бераг,
і там над памяццю чаруеш,
гатовая ў чарговы раз адкрыць
імперыю
і веравызнанне
кахання.

**2.**

Пакінуўшы
ў спакоі цішыню,
цябе шукаць
я ў горад выйшаў,
і быў вышэй
за вершніка бляшанага
на ратушы
бясконцы
крык душы.
За душным сонцам
кульгаў на мыліцах
аблокаў цень —
у гэты дзень

царкоўны звон
паветра вонкі варушыў,
нібы круціў
імгненняў вечнасць,
і разгараўся ўсё ярчэй
сухі і хрусткі вечар
тваіх вачэй.

**3.**

.........................................
Адзін
вяртаюся ў журбе
дадому —
скарыцца
і здолець не прагаварыцца
ў таемнай споведзі сабе
самому.

KAMUNIKAT.org

## САМААДЛЮСТРАВАННЕ

**1.**
У час
часовага скanання
доўгачаканым летуценнем
з'яўляецца кахання цень.

**2.**
У мройным нібыгорадзе,
дзе прыхадням
з дзікунстваў дня
мяняюць
строгую архітэктуру страты
на парнаграфію абстрактных
формаў,
я марна
спрабаваў уратаваць
абрысы тонкіх пацалункаў
і стройную структуру сцёгнаў,
падораную чысцінёй.

Смурны,
як ногі чорных манекенніц,
я варушыўся ў плашчаніцы
ночнай жарсці,
і ўрэшце жорсткі сон абрынуў
цяжарны,
забаронены ўспамін
пра рух рукі,
замураваны ў радавод
грахоў цяжкіх.

**3.**
Мінулае
кранула стомай
і знерухомела
зламаным у грудзёх лязом.

Адлюстраваны ў зрэнках
марудных дзён,
разгадваю
заблытаную
манаграму кармы
і, зачараваны,
кручу нязморна
сама-
пакарання жорны.

KAMUNIKAT.org

**БЕЗНАДЗЕЯ**

**1.**

Я зырваў з твайго неба апошнюю зорку дзіцячай цноты. Я адкрыў табе Залатога Бога, які спрадвеку асвятляў людскую адзіноту. На пачатку ён слепіць вочы, а потым без яго цяжка быць шчаслівым.

Ніхто так не маліўся Залатому Богу і не разумеў яго, як мы з табой.

Сястра паўзмроку, ты прыходзіла ў жытло майго чакання, распальвала агонь шчырасці, і вясёлыя чырвоныя водбліскі пачыналі гойсаць па цёмных, будзённых сценах.

Абалонкі нашых душаў гарэлі прагай зліцця, і ўзнёсласць разбэшчана аддавалася пачуццю пагарды, пагарды да ўсяго, што замінала шалу суладдзя. Гарачы подых адданасці плавіў воск розуму і кідаў у слодыч небыцця.

Але неяк раз неасцярожны зварот да рэальнасці разбіў келіх еднасці, віно крыўды заліло полымя спагады, і зёл паўзмроку ап'яніў непаразуменнем. Вэлюм чужыні закрыў аголеную ўзаемнасць. Безнадзея тлела падманам і падбіралася да выбуху расстання.

У роспачы паняверкі мы падня лі бліскучае вечка няпэўнасці і пачалі перабіраць клавішы стоенай праўды. Часам апошняя песня надзеі зрывалася на стогн немінучасці, і тады мелодыю падхапляў вецер мусовасці. Ён роспачна лямантаваў і шпурляў у расчыненае акно душы першыя лісты бясконцай журбы. Яны зжаўцелі ад горычы і пакінулі на вуснах слёзы безнадзейнай пяшчоты.

Залатое сонца выцвіла ў сівым тумане, і пярсцёнак развітання заручыў мяне з самотнымі ўспамінамі.

Толькі цяпло сустрэчы можа адчыніць храм кахання і здрадзіць холаду адзіноты.

Наш Залаты Бог раздваіўся.

**2.**

У горад любові і шчасця прыйшла нечаканая госця і сталася ў ім гаспадыняй.

Я дарыў табе кветкі і пісаў вершы, ты не хацела любіць мае роспачы, а дрэвы на нашых алеях ужо паміралі.

Лісце згарэла ў каханні...

Апёкі сонечных пацалункаў зрываюцца з аголеных нерваў і падаюць пад ногі халоднай абыякавасці. Яркай чырванню адзінокіх сэрцаў наліваюцца гронкі рабіны, і ляціць, ляціць павуцінне ўспамінаў, чапляецца за рэшты страчанай пяшчоты. Вецер самотна

варушыць пажоўклую коўдру на ложку лета, і зашыты ў далягляд дождж мые цыганскімі слязьмі беспрытульнае сэрца восені.

Калі каханыя нас пакідаюць, настае восень…

**3.**

Кожны ўдар сэрца — гэта пульсацыя ў свеце кахання, дзе немасць болю расцякаецца ў чарнату касмічнай пакуты.

Адзін…

Паміж нашымі планетамі халодная бясконцасць выпадковасцяў. Зорны аркестр мігціць у тахт страце, поўнач здзекуецца з маёй адзіноты пранізлівымі скрыпкамі — прамянямі з недасяжных зорак.

Пякучыя птахі-ўспаміны сутаргава ляцяць на прывіднае святло летуценняў праз цемру рэальнасці і нагадваюць той час, калі пакліканы ідэалам я перацісную аорту недаверу на сэрцы заўсёднай чужыні. Земнае ўвасабленне мары вабіла ў распрануты давер душы панаднымі вачыма, а я быў без пэўнасці: баяўся стаць тагасветным. Цяпер толькі каята гвалтуе перажытыя часам грахі, і нястрыманае памкненне да пазамежнасці жыцця атручанай крывёю бруіцца ў венах надзеі. Скуголіць абарваная струна, а горад маўчыць нежывою багнай вокнаў — дарма шукаць у цемры згубленае на прасторах святла.

Адзін…

Яна засталася па-за межамі майго існавання, якое адразу страціла сэнс. Бо не бывае распяцця духу без апірышча цела.

Яна засталася па-за часам, які безнадзейна завітвае на агоньчык у маіх далонях. Кожны тужлівы ўздых цыгарэты аддаецца рэхам яшчэ аднаго кроку да найвышэйшай асалоды жаданага забыцця — смерці.

Адзін…

Я трачу ўсведамленне і прыходжу да яснага разумення недасканаласці шчасця як першай ступені трагедыі кахання. І няма прытомнай існасці, здольнай запаліць роспач, каб асвятліць дарогу ў мінуласць. Ненароджаныя развагі аддаюць месца пачуццю, і кожны новы крок пазнання сэнсоўна пазначаецца рысамі расчаравання па дарозе ўглыб нікчэмнага.

Датыканне да ідэалу апякло рукі, і найжахлівейшым робіцца імгненне, калі праз далоні пачынае сыпацца пясок будзённай мітусні, што хавае амаль метафізічную ўзнёсласць.

Няспыннае чаргаванне шалу жыцця і смерці…

Роспач і надзея…

Бясконцасць…

**НЯПЭЎНАЕ**

За межамі абмежавання
жыве жывая жвавасць жалю.
Рыпіць наверсе, на страсе,
вандроўнік-флюгер —
пытаецца ў чарговай зоркі
пра страчаны арыенцір.
А недзе на далёкім моры
прачнуўся вецер — белая зіма
чакае часу распрануцца.

*
У доме старым,
дзе сто год не было адзіноты,
рыплівыя ложкі стаміліся
помніць каханне:
прыйшоў апошні летні дзень,
які не стане ноччу шлюбу,
а ўвечары — няўтульна жыць.
Пакой,
пакрыўджаны маўчаннем,
забыў прылікі і таемнасць,
па-змоўніцку шаптаўся з паркам
сваім расчыненым акном.
Ёй пераказваў нашы рухі
і спадзяваўся на ўзаемнасць,
чырвонай стужкай далягляду
завязваючы вочы дню.

*
Празрыста-залатая чырвань
сканцэнтравалася на шыбах,
і профіль, схілены
над дрогкай кранутасцю струнаў,
нагадвае восень.
Падораная ратаваннем,
мелодыя вечара марыць
пра доўгія пахі дажджу.
Халодны твар няголенага неба
схаваўся ў дым, каб не глядзець

як самадастатковасць люстра
ў сабе захоўвае незразумеласць.

*
У прыцемку густой алеі
зялёныя скульптуры сняць
зямныя, бронзавыя сны.
Алтар начы чакае
ахвяраванняў,
а мы ламаем пал запалак
аб зачарсцвелае чаканне
і, гордыя, як дрэваў кроны,
усход па душах расхінаем.
Навошта доўжыць развітанне,
калі душа ўжо дагарэла —
мажлівасць нарадзіць
дзіця
пакінула сляды,
закінутыя ў прысак?

*
Распрануты птушыны гоман
стаіўся недзе каля вежаў,
і ў вежах рэха пасяліўся гоман.
Рэальны ў ценях небыцця,
сон ціхай сапай расціскае
шкляное цела ліхалецця.
...як дзіўна корпацца ў сабе
і марыць пра стыхію мора,
дзе Уліс
кранаўся часу
сваім бясконцым падарожжам.
Дзесяць год...

knihi.org

**ГЕРМАНІЯ**

**1.**
Неардынарная Еўропа
на вузкай брукаванай карце
ў галаграфіі акна.
Германія.
Гатычная зіма
на бел-чырвона-белых дахах,
чужое неба,
як у сне,
і наш
звычайны
беларускі снег.

**2.**
А можна
марнаваць Германію
ў прывабнай,
нібы алкаголь,
адтуліне часовага прытулку:
на стромых прыступках,
як п'яны,
эратычны чорт,
мулатку вабную чакаць.
Гатэлю
нельга спаць,
калі за кожнымі дзвярыма —
рыплівы тытунёвы пах,
якім самотна разганяюць
згадкі пра свае краіны.
Яна адна.
І ты адзіны.

**3.**
За тысячы
адлегласцяў быцця
даецца права
забываць
ультрамарынавыя сны падману.
Але Германія

вачыма цёмнаскурай ночы
адкрылася,
як успамін
пра ўсіх нязведаных жанчын.
У мару ірвануўся
германскі ранак
рамонкавым мігценнем бра —
на поўнае дыханне браць
дзве цёмныя,
тугія поўні,
гарачыя ад шчасных слёз…
І чорны аксаміт грудзей —
адлюстраваннем
былых і будучых
каханняў.

**4.**
Германія.
Раптоўны вырай,
з якога вырас-
лі птушыныя дарогі
ў Боскі Рым
Радзімы.
Гадзіны,
вартыя вяртання,
і прагартаная старонка,
дзе Рэйн халодны
асалодна злізваў
усмешку
чорнай Моны Лізы.

*Франкфурт — Гёрліц.*
*2 лістапада 1994 г.*

**ТВОРЧАСЦЬ**

**1.**

Сонныя лілеі на цёмнай вадзе прагнуць неба. Але тонкія, як мара, ніткі з пэўнасцю дабрабыту трымаюць кветкі ў дрыготкай застаяласці. І толькі адарванае сцябло дазваляе красе зліцца з небам у няведамасці туманнага далягляду.

Калі выпадае снег, мы не бяжым сустракаць яго, а кладземся раней спаць. Бо думаем, што гармонія велічнага спакою і зімняй сцюжы дыхае сюжэтам бяссэнсавасці.

Выкапнёўства мастацтва і астраномія побыту асуджаныя на адзінства, як фантастычная рэчаіснасць і рэальнасць летуценняў.

І толькі калі забываецца галоўнае рамесніцтва — быць жывым, ядро чалавечага духу распраменьваецца на думкі, што насычаюць спрадвечную цікаўнасць людства.

Зліццё адданага і запатрабаванага дасягае цэласнага ўва ўсведамленні, дзе чаканне рыфмуецца з змаганнем.

Творчасць пагардліва кленчыць перад абывацелем, а той дорыць ёй свабоду сваёй абыякавасцю. Абыякавасць выношвае ўзнёсласць.

Традыцыйна заліты кавай і засыпаны цыгарэтным попелам альбо стэрыльна чысты пісьмовы стол адухаўляе сімвалізм рэчаў.

Поўня высокіх сэнсаў выцягвае сокі жыцця і помсціць за тое, што яе пакінулі ўначы. Патрэбнасць працы захлынаецца начніцамі і спадзяванне без відомай падставы крышталізуе мудрасць спазірання.

Маланкі асацыяцыяў расплаўляюць думкі на вобразы, і сырое паветра разумовай працы ператварае рымскую дзявоцкасць ведаў у паўночны мегаполіс адкрыцця.

Арганізаваныя пачуцці рухаюць асцярожнай мускульнай сілай, і невымерная іерархія каштоўнасцяў спрошчваецца да каласальнасці скразнога графічнага руху.

Алергія на псеўдазначнасць ідэалагічнага смецця ператварае скрываўленыя раны душы ў пунсовыя ружы шэдэўраў.

Энергія творчага супарату канцэнтруецца ў калектыўную індывідуальнасць фаліянтаў, дзе жывая пластычнасць рухаў спіць, распарадкаваная ў чаргаванне літар і радкоў.

Хуткаплыннасць абвостранага ўспрыняцця кладзецца на эстэтычную вечнасць паперы з надзеяй на бясконцае перасэнсоўванне.

**2.**

Мы разумеем, што верхавіна дрэва ў космасе, толькі тады, калі лісток, прыляцеўшы з цемры, чапае шчаку мёртвай цеплынёй.

Прагнасць позірку ўскрашае існасць, падораную атрутнай прывабнасцю начнага свету і насычанай шчыльнасцю дзённага харáства (сінтэзам паўнаты рэальнасці) сухому шамátанню прапыленых старонак.

Змястоўная ёмістасць вобразаў нішчыць ходкі мяшчанскі фальклор, што танным рамансам казыча слых банальнасці.

Культурная насычанасць устойлівых формаў існавання існасці стрыманай аб'ектыўнасцю ўзаемапрасякнення балансуе ў гармоніі высокага і нізкага, будзённага і ўрачыстага.

Вызваленне ад мовы стэрэатыпнага ўспрыняцца цяжарам невыноснай волі шырыць думкі ў неабсяжнасць першаснай чысціні сэнсу.

Крылатая любасць да новага працуе над сівой безданню спарахнелага жыцця і выносіць прысуд шчырасці запраўднага.

Гармонія супраціўнасцяў рухае інэртную свежасць успрыняцця, а вобразны дыяпазон сучаснасці вымярае прышласць адзнакамі абсалюту.

Калі спасціжэнне ідэалу адмовіць шалёную экзальтацыю рытарычнай пасярэднасці, у глыбіні лёту ўсведамлення народзіцца абсалютная строгасць ведаў.

І тады запраўднае разуменне ніколі не скажа пра далакопаў, што яны штурмуюць неба.

**ДЫЯЛОГ-І**

— Абавязак творцы — зацікавіць жыццё.

Што такое арыгінальная нечаканасць? Яна ўзмацняе цікаўнасць, але і ўводзіць у рызыку расчаравання.

Падзел высокіх узораў спусташае.

Перад чым схіліць галаў?

— Нічому і нікому не пакланяцца можа толькі той, хто нічога і нікога не адмаўляе.

Абставіны фармуюць пачуцці, і адчуванне загараецца натхненнем у мажлівасці нараджэння немажлівага. Талент сцвярджаецца праз ужыццяўленне.

У існасці пераход цалкам верагоднага ў мажлівае — заканамернасць выкрыцця.

— Памкненне завалодаць сведамасцю сутыкаецца з адказнасцю за выказванні, бо накідванне паглядаў цісне складанасцю на вочы аднаго і драбязой на думку ўсіх.

Ці можна цікавіцца тым, пра што думаеш, калі думкі твае і цікаўнасць запазычаныя ў іншага?

— Слушна, індывідуальнасць ніякавее ў агульных гледзішчах, а нутраная супярэчнасць еднасці працівіцца агульнасці індывідуальнага.

Узаемаадмаўленне супярэчнасцяў падтрымоўвае іх існаванне на розных палюсох, якія дзеля самазахавання ніколі не сутыкнуцца. Адмаўленне ніколі не зліецца з сцверджаннем, інакш яно перастане быць адмаўленнем і гармонія парушыцца.

— Стабільнасць стварэння і ўжыццяўленне неверагоднага паміраюць у тлумачэннях.

Адзінота шліфуе і выхоўвае, але выяўляюць толькі дачыненні, бо індывідуальнае неверагоднае без масавага.

Ці можна захаваць годную самавыразнасць успрыняцця ў калектыўным сцверджанні часу, калі існасць адмаўляе агульнасць?

— Каб гарэць для агульнага вар'яцтва, не абавязкова быць з іншага матэрыялу. Досыць ісці наперакор і на вялікай хуткасці.

Стабільнасць неверагоднасці ў вынятках. Узнёслая пагарда індывідуальнага жывіцца аб'ектыўнасцю рэальнага і знікае ў абсалюце незразумелага.

Нянавісць да дробязяў захоўвае любасць да цэласнага.

— Вылучная чысціня абсалютна празрыстая і заўважаецца толькі на фоне вылучнага бруду.

Толькі пачатак і канец даюць адчуць бясконцасць. Тады адзіная адказнасць перад нараджэннем замыкаецца ў абавязку смерці?

— Маналіт распаду мінулага цячэ ў няпэўнасці цяперашняга і застывае ў крохкай няведамасці будучыны.

Схільнасць да знішчэння жыве ў праклёне стварэння, дзе творца — розум, а матэрыял — рэальнае ўспрыняцце.

Толькі ўва ўзаемазнішчэнні цемры і святла можна назіраць і адлюстроўваць цені і адценні, якія і ёсць жыццё.

KAMUNIKAT.org

## ДЫЯЛОГ-II

— Ты хочаш навучыць мяне прысвячэнню сабе і дазваляеш адчуць вытокі ўстановак памкнення.

Але ці можа быць адмаўленне ўласнай існасці як першы крок спасціжэння?

— Медытацыя любові загартоўвае аднолькавым шчасцем адданых і ворагаў, бязвінных альтруістых і наўмысных забойцаў непраяўленага, а значыць — незразумелага.

— Адзіна мажлівая і найпэўнейшая гарантыя любові — калі смутак спачувае застаялым меркам.

Чым апраўдаю з'яўленне пагарды — спачуваннем?

— Росквіт незразумелага ўплывае на падсведамасць.

Не абавязкова псаваць наладжаную радасць, каб зразумець жаданне.

— Той, хто ссячэ маладое дрэва, не будзе пакутаваць дзеля пераспелых пладоў і бессэнсоўнай гнілі. Адзінае, чаго яму не будзе ставаць — ценю ў спякотны дзень.

Дзе гарантыя будучай міласэрнасці, узрошчанай на даніне заказанай беспасярэднасці?

— Няспынная дабрыня і дасканаласць гармоніі запатрабаванага і аддадзенага не вымагаюць перапынення плыні задавальнення. Досыць толькі моцным набліжэннем раструшчыць спакусу.

— Аддзяленне спакусы ад задавальнення вызваляе розум ад слабіны пачуццяў.

Спакой дасканалага свету «няслушных» учынкаў выстаўляе адмоўлены розум у смешным выглядзе. Якім спосабам дух запануе над матэрыяй?

— Трагедыя смеху — неасэнсаванае абяленне чарнаты дрэнных учынкаў.

Сцвярджэнню дабрачыннасці, якая яшчэ не існуе, заўсёды не стае яе шчырых шуканняў.

Папераджальнае знішчэнне мінулага на карысць хуткаплыннай запраўднасці, згубленай за межамі ўспрыняцця, вядзе да ўваскрашэння знішчанага.

Ментальная бесклапотнасць вышэй за матэрыяльную любасць і астральную нянавісць.

У выніку — з'яўляецца ўпэўненасць.

## СМЕРЦЬ ЧАКАННЯ

*Юрасю Лаўрыку*

Як толькі джаліць думка далеч
і жменю жвір журбы не абражае —
ты ад'язджаеш...

Ці не заўчасна
разлічаная будучнасць удачы
мінулае ператварыла ў тлен.

Ты не калені ўласныя зламаў,
а кола лёсу, калі без слёз
узлакаціўся
на аналой чакання.

Спантанна
пазадзе таннасці падзей
успамінаю рэфлексіяў
сумесную надзею.

Дзе я
без цыгарэт, атручаных
штодзённай кавай,
і разваг — як важна
цаніць цнатлівы час наш чалавечы;
адвечнасць — чакай і вер —
адчыніць дзверы
і мора вернасці вар'яцкай мэце
размые чарнату
жыццёвага цяжкога ачмурэння.

О лёс высокіх прызначэнняў!

Сужонства жаху з жалем
ходзіць недзе
па беразе бразготкай адзіноты.
І не спытаеш нават на самоце
ў стыхіі холаду і хваляў —
хто ты, дзе ты, і навошта
знішчае пошта шпаркія лісты.

KAMUNIKAT.org

Ты — шоргат часу. А затым
шчаслівы і вы-
сокі голас голай праўды.

Дальбог! —
Каб мог, і я прыбраў бы
ўслед за табой двубой прыбою
з берагам.

Не зберагае
гаючасць сцятасці і адчужэння…

Скажэнне
думак і выразнасць формы
фармальна адлюстроўваюць
складанасць
любой адданасці
і немажлівасць быць паасобку.

Узлёт асобы
на зломе мізантропіі і мазахізму
змяняе прыназоўнікі азоў
на назвы звычак.

Надзвычай
хочацца ізноў зазнаць
неадназначнасць спрэчак.

Так недарэчна
на самым піку разумення
нас раз'яднала
змушанасць ісці ў абход
складанасці быцця.

Хіба цяпер цябе
засцеражэ
няўцямны лёс,
скажонасць памяці і цень
заўжды тваёй і ўсё ж чужой табе
Жанчыны?

Без прычыны
яшчэ ніхто не падышоў
да шавінізму духу
ў пошласці бязмэтнай.

З імпэтам
і трагічнасцю эгаістычнага служэння
я адзначаю сваю роспач і паражэнне.

Удвох мы аддаем табе ў дарогу
парог і мерку перманентнай вышыні:
шануй няздольнае і на чужыне дагарэць
ажыццяўленне часу і чакання смерць.

*18 ліпеня 1994 г.*

KAMUNIKAT.org

**РЫЗЫКА**

Уцёкі ў адзіноту.

Устрыманне гарыць пажадлівым агнём і знікае ў кіпні прагных вачэй, сухіх, як глыбіні акіяна.

Правіна духу эгаізму расце ў геаметрычнай прагрэсіі з п*а*даннем цела альтруізму.

Узнавіць згубленую дабратлівасць адмаўленнем самаахвярнасці — і застацца бязвінным злачынцам.

Каханне забівае раба ў тыране дзеля прафанацыі сяброўства праз немажлівасць разгадаць маўчанне.

Шукаю згубленую перапоўненасць сэрца ў пустаце і ў самазнішчэнні — прывіднае святло любові да бліжняга.

Зорны бляск перасоўвае святло арыенціраў старога руху ў бок новай сілы, за якой — бездапаможная слепата дэзарыентацыі.

Заняць сваё месца ў жыцці, знішчаючы рэлігійным экстазам багацце і ўладу, украдзеныя ў забітага жабрака.

Адмаўленне свету ўчынкаў вымушае волю прывязацца да слупа пакрыўджанага шчасцем духу.

Рызыка жадання, агульная для ўсіх беспрытульных, далучае небяспеку ўратавання да сканцэнтраваных у выбух эмоцыяў.

Два бакі б'юцца за гонар пазіцыяў, не зважаючы на трэцяга, які палівае моцныя карані спарахнелага дрэва.

Напаіць атрутай салодкія вытокі горкага дачынення і не крыўдаваць на трутняў, што асушаюць слёзы зорным пылам.

Настаўнікі вызваляюць вучняў ад нянавісці шляхоў у злачыннай пакоры ўзорам.

Іржа стварэння раз'ядае крокі журбы на дарозе грэшніка, змарнелага ў спасціжэнні паўнаты існавання.

Жалеза ніколі не здаволіцца перамогамі шаленства слушных учынкаў над хваробамі рукі, якая трымае нож.

Цені добрых спраў злодзеем крадуцца і сарамліва застываюць, прыціснутыя да сцяны апраўдання.

Унікнуць выніку дабратлівых паводзін адзіным ратункам гармоніі — заўсёдным хаосам кароткага забыцця.

Энергія светлых спадзеваў стамляецца канчатковым поспехам і трапляе за краты неабсяжнай свабоды.

Задавальненне стомленых пачуццяў.

Безвыходнасць.

## ШУКАННЕ АДМОВЫ

Зародак страты веры жыве ў звароце да шалёных шуканняў яе адмовы.

Бяру акорды, не ведаючы нотаў і парадкавага нумару песні, спадзяюся на рэальнасць і жыву тагасветным з апорай на няведамае.

Празоранне канца пачуццяў адмаўляе рыхтаванне да яго праз нецярплівасць, дзе давер да мінулага — рэлі хісткага мастка ў будучыну.

Сумныя эмоцыі кахання…

Тужлівы Эрас суцяшае светлы ўздым шчасця, змучанага ў пакутным спадзяванні на лепшае ў горшым, на заспакаенне ў шаленстве, і стыхія полу насычае платанічнай сілай падсведамыя сны надзеі.

Пільная патрэба задавальнення ў умовах ілюзорнага свету нечалавечых працэсаў набліжае надзвычайныя эксцэсы прыгнечанага дакладнасцю светаўспрыняцця, у якім не адчуць хуткаплыннай часовасці колішняй смерці.

Нястача надзеі і лішак сілаў сумуюць жарсцю юнацтва ў аптымістычнай безвыходнасці пачатковага, і адзіным апраўданнем заўсёднай злосці ёсць выпадковы гнеў.

Памкненне да вечнасці хварэе на жаноцкасць, змагаецца за прыцягненне пачатку да канца і штоімгнення варагуе з жаночым у сабе.

Сугучнасць зліцця яшчэ да нараджэння канае ў затохлым паветры чакання, спадзяванне цікуе за нявызначанасцю, і шчырая наіўнасць міжволі робіцца найвышэйшай мудрасцю памеркавання, бо падмурак будзённай вечнасці — гарантыя святочных імгненняў шчасця.

Запраўдным суцяшэннем служаць толькі першыя акорды апошняй мелодыі.

## ШКЛЯНАЯ ВАР'ЯТНЯ

**A**
Дзе момант і вось разумення паўтораў?

Прырода адчула ў бясконцым каханні
сваю неўміручасць, і недзе ў глыбінях Сусвету
прасяклася жарсцю і рушыла лютая сцюжа.

**B**
Разбіла лета сонны саркафаг,
дзе спачывала госцяй hostia* цяпла,
і камень гарачы прывабіў іржу
пераспелай шыпшыны.

Стамлёныя дрэвы не ведалі,
дзе іх прытулак — ствалы,
нібы ногі пажоўклага лісця,
тапталі жаночыя формы зямлі,
а вечар стоена сачыў, як дрогкі
і чырвоны грэблік сонца
вычэсвае з галля агонь.

**C — V**
…………………………………………

**X**
Уголас гарэла жывая трава,
а пасля гэты спалены шэпт прыгіналі,
імчаліся ветрам схмялелым
неспакойныя коні — залатыя,
апошнія коні зямлі.

А спераду, за далягдядам,
палымнела й кахалася з небам барвовым
шкляная вар'ятня —
там босыя людзі-расліны вытоптвалі зоры
падэшвамі гулкіх жалезных скафандраў.
І стук яшчэ нячутных капытоў

---

* Hostia *(лац.)* – ахвяра.

людзей ужо раструшчыў — кожны памірае.

**Y**
Каханне параніць прываблівы позірк
Сусвету, і з прабітых вачэй пралiецца
халодны i чорны крышталь,
і цемра агорне зямлю. А кроў закіпае,
і звонам пабітага шкла адзываецца рэха
на крык прадсмяротных памкненняў:

За межы!..
На волю!..

Ратуйма гаючыя пахі!..

...толькі коні лятуць праз забытае рэха...

**Z**
І восені болей ніколі не будзе —
хаваецца восень у хуткім знікненні
параненых марай, залітых у чорны крышталь
залатых скакуноў... і Сцюжа спачне
на разбітых будынках
людскога шклянога вар'яцтва:
арэна, дзе Час паўтарае
бясконцую п'есу пра СМЕРЦЬ.

## НАКАНАВАННЕ

Узаемнасць страсці! —
выпадковасць.
Падкова
шчасця
сціраецца
аб дол
здаволенасці
ў часе.
Як часта,
нават адмыслова,
за згубленай
разгубленасцю
блазна
знікае
Слова.
Слава Богу!
Бо гады
гайдаюцца, як нер-
вы. Высокі грэх рэ-
алізуецца
ў Нірване.
Яшчэ адным параненым
каханнем
сустрэне на світанні
рванасць сонца
і святасць раны.

Беззаганны
жыццёвы сон,
як скон,
паўстане
насуперак змаганню,
і ноч заплача
ад нястачы
паўтораў
гора.
Горад
з пустой упартасцю жанчыны,
нібы дзіця на корак вінны,

KAMUNIKAT.org

начэй правіны

на промень
апраметны
прамяняе.
Пра мяне
ў пустым трамваі
сум ускраін,
напоўнены
падзякай поўні,
не ўзгадае —
да звычайнай
і адчайна
законнай згоды едзе.
А недзе
ля тэлефона
на фоне
стратаў і самоты
святкуе старасць страсці
Адзінота.
У тон на-
строю б'е па скронях стро-
гімі гудкамі
безадказнасць.
Сказаны
ўсе словы ноччу.
Вочы
не хочуць болей
боль сурочыць,
і, здрадам рады, недавер
за дзверы
ўцёк,
як цень
ля ног паненкі
ўкленчанай
хлусні.
Ні я,
ні ён
не вернемся ў ня-
шчасны сон най-
лепшага кахання.

## ТВОЙ ДОМ

Чым больш жывем мы паасобку,
тым болей хочам разам паміраць.

*
Хіба хто-кольвек уцякацьме,
пакуль давер твой не нагрэе
ручай застылых аддаленняў,
а ціхамірнасць адзіноты
не ўскінецца шукаць прытулку
на раз'яднаных выспах шлюбу.

Ты не святы,
каб на крыклівую нязгоду
цярпліва песціць спадзяванне,
ты проста збоку назіраеш,
як пры любя-якім надвор'і
ўпарта
імкнуцца цягнікі спагады
да станцыі чужога болю.
Няўжо табе гэтак патрэбна
шукаць нязнойдзенае ў стратах
і нішчыць цёплую штодзённасць?

А здрады ўласных перамог,
дарэчы, нішчаць узаемнасць —
непадтрыманая душа
дашчэнту разбіваецца аб сэрца,
і з гулам тулава туляецца
ў зачыненым
і цёмным сховішчы чакання;
і не выбухвае вясёлым пратачэннем
праз дзверы званок забытага жытла,
і б'е пад дых маўчанне тэлефона,
і больш нікога нельга запрасіць...
Навошта мёртвым абуджаць жывых,
калі ўжо помнікі стаяць за абгародамі?..
Ты сам знішчаў свой смутак па сабе,
ты расціскаўся да бязмежжа кропкі,
і праз сусвет, затоены ў сабе,

ты пратачыўся ў вушка голкі,
праз якое
па век не прасмыкнуць вязанкі
чужых пачуццяў і памкненняў.

*
Ты сам хацеў прывабнасці
будынка, якую б не размылі хвалі
статычных падарожжаў
па энергічнасці замкнёнай кропкі.

Дажджынкі не злічыць на шкле,
і тыя, што жывуць з табой —
адкуль іх столькі наляцела?
Ты сам іх падбіраў і засяляў пакоі —
адзін з дзесяткаў, нават соцень,
праходзіў праз патрабаванні
і мог пераступіць парог.

Ты шчыра раздзіраў душу
і раскідаў вакол сябе самога,
і кожны з тых кавалкаў
быў каханкай ці адзіным сябрам.
Яны — раздораныя часткі,
намнога большыя за шчодрасць
і болып буйныя за цябе самога.

Ты назапашваў іх адданасць
і біў бязлітаснай пяшчотай,
каб кожны мог прапахнуць сокам
разгрызенай тваёй душы.

*
І чым шчыльней жылі вы ў доме,
тым больш таемным быў пакой,
дзе ты збіраўся паміраць.

## ЭПІТАФІЯ

*Людзі паміраюць, бо захлынаюцца ілюзіяй часу, памножанай на абмежаванасць прасторы, і баяцца адвечнага супарату колькаснай якасці людства і якаснай колькасці багоў.*

*М. К.*

Калі смяецца тагасвет,
рэальнасць пачынае плакаць.

Хто можа нырцануць
у шчыльную ваду жыцця,
што сквапна выдзяляе
адлічаныя ўдары сэрца,
і з падсвядомых успамінаў мора
сляпіць спакойна вочы
зорным бляскам?

Шчаслівы шлях, які вядзе
канкістадораў ведаў
і арганаўтаў пачуцця
ў схаваны сэнс і ў існасць рэчаў:
а там зямля, ім абяцаная,
якая сілы паддае пад небам
раструшчанае цішыні.

Сцярвятнік часу пільна сочыць,
як неўчынёныя учынкі
перасыпаюцца пясчынкамі
ў шкляным гадзінніку быцця,
і на пакорную адданасць лёсу
адказвае змяншэннем поля,
дзе каласіцца дасканаласць.

Інстынкт бязмэтных існаванняў,
непрыручоны сілай духу,
бязвольным сунецца натоўпам
і збочвае
з праспекта самаўдасканалення
у цёмныя прысады,
дзе ад былога застаюцца

разбітыя ліхтарні
здаволеных жаданняў цела.

Навошта назапашваць мроі,
калі ўсё роўна невядома,
што пераможа — плач ці смех?

Агульная бяскрыласць люду,
стаптанага супольным тупаценнем
па празаічнай роўніцы дарог,
не здолее адолець выпадковы,
наўмысна выпараны хворым уяўленнем
свет, але…

На зломе старой і новай эпох, калі Святло канчаткова пераможа, між прагартанымі старонкамі сонечнага часу супакояцца стлелыя дзьмухаўцы падману і там, дзе размыты краявід выпадае з-пад увагі цмяных будняў, не будуць з'яўляцца недасканалыя падробкі твараў, няздольныя, бы выцвілая амальгама, адлюстраваць глыбіні ўласнае душы, бо тых глыбіняў ніколі й не было…

Самаздаволеная ўпэўненасць
у слушнасці інстынктаў
крывымі пальцамі зажытых догмаў
запальвае газніцу
асуджаных наканаванняў,
і застаялае паветра змрочных дзён
кладзе граху пячатку
на твары з рысамі выродства —
штодзень старанныя прыстасаванцы
гідліва сплёўваюць
магчымасць развіцця,
а ноч іх насычае новай злосцю.

Упартае зліццё ляноты з ліпкім
плывам спадкавання прымітыву,
нявартым нават пахавання
ў балоце сытых і дазвання сцертых твараў,
бы цеста,
шырыцца на ўсе бакі

мажлівых вычварэнняў.

Адны прыхільнікі
adversus* бляску формы,
багатыя праявамі нескарыстаных
сілаў,
валодаюць раскошай і жаданнем
шукаць забытыя наканаванні
і памятаць сіроцкі радавод
уласных жыццяў.

І толькі тым, хто памірае,
без канца шукаючы сябе,
даецца воля, права і самота
і сцежкі-ніткі да вышынь
спрадвечнае калыскі магаў
і мудрасці надчалавецтва.

Народ смяецца і цкуе
той ордэн taedium
vitae*, не ведаючы, што бясконцасць,
якая існуе па-за абсягамі апошніх сноў,
ім дорыць адвароты смерці.

У ноч,
калі знікае геній,
на небе сустракаюць Бога.

* Adversus *(лац.)* – супараты.
* Taedium vitae *(лац.)* – непрыхільнікі жыцця.